Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***М.М. Караткоў*** (Магілёў)

# ПАКУТЛІВЫ ШЛЯХ ДА ІСЦІНЫ

Драма А. Дударава "Парог", упершыню пастаўленая на сцэне ў 1981 г., стала адметнай з'явай у беларускай літаратуры таго часу. Занадта ўжо нязвычным для савецкай драматургіі быў галоўны герой твора – Андрэй Буслай. Прафесіянальны алкаголік з чатырохгадовым стажам лячэння, да таго ж нейкі не такі, як іншыя... Не дзіва, што п'еса выклікала неадназначныя ацэнкі, ажыўленую палеміку ў літаратурнай крытыцы. Цалкам натуральна, што менавіта на вобразе Буслая, які побач з вобразам пісьменніка-

казачніка Пакутовіча з'яўляецца галоўным для разумення аўтарскай канцэпцыі чалавека і рэчаіснасці, і сканцэнтравалася галоўным чынам увага літаратуразнаўцаў. У іх працах дастаткова выразна акрэсленыя многія аспекты характару і драмы галоўнага героя твора, яе сацыяльныя вытокі. Н. Аксёнчык, у прыватнасці, у цэлым слушна заўважае, што ў гісторыі Буслая адлюстраваліся "супярэчнасці нашага часу <...> калі разбураюцца маральныя асновы жыцця і лепшыя чалавечыя якасці людзей, якія жывуць толькі думкамі аб уласным дабрабыце...", а гэта прыводзіць да "унутранай незадаволенасці чалавека жыццём і самім сабою <...> да канфлікту з грамадствам" [1, с. 104].

Думаецца, аднак, што такая з'ява назіралася і назіраецца не толькі ў тыя часы, што адлюстраваныя ў п'есе. Яна – пазачасовая і, можна сказаць, агульначалавечая, як і тып Буслая. Наўрад ці правамерна разглядаць п'янства Буслая як вынік "страты ім маральна-этычных каштоўнасцей, жыццёвых ідэалаў" [1, с. 104], калі мець на ўвазе тыя ідэалы, што прапагандаваліся тады ў грамадстве. Ён іх і не прымаў, бо занадта выразна бачыў разыходжанне паміж словамі і справай: "Паказуха ўсё гэта. Маральны капітал, які заўсёды можна абмяняць на звычайныя рублі і капеечкі ..." [2, с. 127]. Такое назіралася, бадай, у любую эпоху.

Урэшце, і самі маральныя каштоўнасці, ідэалы, як вядома, бываюць розныя. Напачатку ў Буслая была адна мара, высненая ў напаўгалодным дзяцінстве – матэрыяльны дабрабыт: "Ведаеш, чым займаўся ўсё сваё пакручастае жыццё? Заробкамі! Каб дом быў, каб гарнітур быў, халадзільнік, вадаправод, катлеты тры разы на дзень..." [2, с. 150-151]. І вось мэта дасягнутая – ёсць усё, што хацелася мець: "Усё!!! Прыехалі, хлопчыкі... Выпрагайце коні, налівайце чаркі..." [2, с. 150-151].

Буслай пачынае піць менавіта тады, калі дабіўся, чаго хацеў, а іншай мэты жыцця не было. Вось тады і пачаліся пакутлівыя пошукі сэнсу існавання чалавека: "Падумаў аднойчы: дзеля чаго ж ты, Андрэйка, жывеш? Каб нашчадкаў пусціць на свет белы? Дык гэта і жабы робяць... Каб мае дзеці жылі лепей за мяне? А што значыць лепей? Лепей елі, лепей апраналіся, утульней спалі... І ўсё? Якая ж гэта мэта? <...> Ці варта ўвогуле жыць, калі шчасце чалавечае толькі ў тым, каб смачней з'есці, мець прыгожую бабу, нічога не рабіць і атрымліваць кучу грошай?.. Ці варта?" [2, с. 146]. Андрэй прыходзіць да высновы, што жыццё ўвогуле сэнсу не мае. А ўсе размовы пра мараль, душу – выдумка, казка, не вартая ўвагі. Таму і сыходзіць з дому, становіцца прыжывальшчыкам (ці шмат чалавеку трэба?), клапоцячыся толькі пра сябе.

Але душа, "казка" ў Андрэю жыве і не дае яму спакою. Пачынаецца барацьба з ёй, спробы, зважаючы на вымогі розуму, калі не забіць яе, то хаця б "закалыхаць". "На сэрцы, калі не п'ю, такая пустэча, такі страх, боль нейкі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

<…> Вельмі шмат пра што думаць пачынаю” [2, с. 124], – гаворыць Буслай Аліне. І расказвае ёй, як прасіў псіхіятара зрабіць што-небудзь у галаве, каб менш думаў і больш адчуваў [2, с. 125]. Змаганне, аднак, аказалася няроўным. “А душа, яна не дурніца! Яна свайго патрабавала… А я яе глушыў гарэлкай! Толькі хто я такі ў параўнанні з душой? У ёй увесь наш сялянскі род сядзіць: справядлівы, чысты, мудры, цвярозы…” [2, с. 166] – скажа потым Буслай у момант прасвятлення.

Праявіцца ў дзеянні духоўнаму патэнцыялу Буслая доўгі час перашкаджаюць яго рацыяналізм, нявер’е ў “казку”, што ёсць людзі, якія сапраўды жывуць “не дзеля таго, каб лепей жыць, а каб лепей быць” [2, с. 152], ды эгаізм. Адсюль і злосць на Пакутовіча, які сказаў Буслаю ўсю праўду пра яго. Невясёлая яна, ды й выйсце, якое Пакутовіч прапануе – не толькі браць, а перш за ўсё аддаваць, – не выклікае захаплення, бо на, першы погляд, алагічная. Да таго ж Буслай прывык перш за ўсё браць.

Аднак горкае лякарства праўды падзейнічала, што выразна праявілася ў выпадку з пахаваннем Бэры пад прозвішчам Буслая. Можа, упершыню нішто не змагло заглушыць у душы героя чалавечых пачуццяў: трывогі за лёс блізкіх, сораму за сябе, раскаяння, нават гатоўнасці да самаахвярнасці. Можа, упершыню ён дзейнічаў у адпаведнасці з такімі “нематэрыяльнымі” паняццямі, як любоў, спагада, сумленнасць. І думаў не столькі аб сабе, колькі аб іншых.

“Усе людзі на зямлі святыя… Толькі забываюць пра гэта…” [2, с. 166] – гэтыя словы Драгуна можна было б паставіць эпіграфам да гісторыі Буслая. Ён пачынае вяртацца да сваёй сапраўднай сутнасці, “успамінаць” яе. І гэта дае надзею на духоўнае адраджэнне героя твора.

**Літаратура**


1. **Аксёнчык, Н.** На высакародным шляху адраджэння / Н. Аксёнчык // Бел. літ. – Вып. 16. – Мінск, 1988. – С. 102-113.
2. **Дудараў, А.** Парог / А.Дудараў. – Мінск: Маст. літ., 1987. – С. 103-170.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова